# МЯНУШКІ ЖЫХАРОЎ ПАСТАЎСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ (ЭТЫМАЛАГІЧНАЯ, СЕМАНТЫЧНАЯ, СТРУКТУРНА-ГРАМАТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА)

**А. Д. Куталёва**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У артыкуле разгядаюцца мянушкі жыхароў Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці, акрэсліваецца паняцце мянушкі, вызначаецца этымалогія, семантыка і асаблівасці ўтварэння мянушак.

**Ключавыя словы:** мянушка; семантыка; этымалогія; функцыі мянушак; спосабы ўтварэння.

*Мянушка* – неафіцыйнае ацэначна-характарыстычнае найменне чалавека, дадзенае па яго знешніх ці ўнутраных асаблівасцях, паводзінах, характары заняткаў, пасадзе, прозвішчы і інш. [1, с. 107]. Імёны, прозвішчы, мянушкі, псеўданімы ёсць у кожнага народа, і яны ў пэўнай ступені адлюстроўваюць самабытнасць, гісторыю, з’яўляюцца элементамі нацыянальнай культуры [1, с. 8]. Мянушка – самае старажытнае з найменняў чалавека. У паганскія часы мянушка выкарыстоўвалася ў функцыі імені і адлюстроўвала нейкія прыкметы, дзеянні, аб’екты знешняга свету. Перадусім гэта было звязана з той магічнай функцыяй, якой старажытныя людзі надзялялі імя чалавека [2, с. 41]. Даследчыкі называюць наступныя асноўныя прычыны ўзнікнення мянушак: недастатковую колькасць афіцыйных асабовых назваў у параўнанні з патрэбамі камунікантаў, імкненне да дакладнай персаніфікацыі пэўнай асобы, выдзяленне яе па якой-небудзь прыкмеце з пэўнага калектыву, асяроддзя [3, с. 108]. Сёння само існаванне ўласных імёнаў, у тым ліку і мянушак, абумоўлена выкананнем імі пэўных функцый: *намінатыўная, ідэнтыфікацыі, дыферынцыйная, сацыяльная, эмацыйна-экспрэсіўная, акумулятыўная, дэйктычная.* Акрамя пералічаных, даследчыкі называюць і такія, як *адрасная, стылістычная, эстэтычная, рытуальна-харызматычная.* Пры класіфікацыі мянушак улічваюцца самыя разнастайныя крытэрыі: абставіны з’яўлення новага члена сям’і, сямейныя адносіны, парадак і час нараджэння, знешні выгляд, фізічныя недахопы, унутраныя ўласцівасці чалавека, сацыяльнае і эканамічнае становішча, прафесія, род заняткаў, пасада, месца паходжання і інш.

Матэрыялам для артыкула паслужылі запісы мянушак жыхароў вёсак Кураполле, Муляры, Пятровічы, Целякі, Турлы, Дварчаны і некаторых іншых Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Мянушкі збіраліся ў розных вёсках, але асноўная з іх – Кураполле.

Прааналізаваўшы сабраны матэрыял, мы прыйшлі да высновы, што найбольшая частка мянушак характарызуе знешні выгляд або ўнутраныя

ўласцівасці чалавека. Пры гэтым мянушка часцей за ўсё даецца па фізічных недахопах і па адмоўных уласцівасцях. Мянушкі ўзнікаюць і функцыянуюць у вузкім асяроддзі – у межах аднаго моўнага калектыву, адной гаворкі, з'яўляючыся паказчыкам адносін паміж яго членамі.

Вылучаныя мянушкі ўваходзяць у розныя тэматычныя групы:

1. Мянушкі, утвораныя ад прозвішчаў: ***Буба*** – ад Бубноўскі, ***Блыха*** – ад Блашкевіч, ***Рудзік*** – ад Руткоўскі, ***Пацык*** – ад Пацэй, ***Гіліха*** – ад Гіль, ***Мандарынка*** – ад Бандарэнка.
2. Мянушкі, утвораныя ад асабістых імён і імён па бацьку: ***Сан Салыч*** – ад Аляксандр Салабута, ***Валерон*** – ад Валерыя, ***Верця*** – ад Вераніка, ***Міцяй*** – ад Дзмітрый, ***Санчас*** – ад Аляксандр.
3. Мянушкі, якія характарызуюць знешні выгляд чалавека: ***Касцюм*** – інтэлігентны мужчына, ***Страказа*** – жынчына, якая заўсёды носіць вуглаватыя акуляры.
4. Мянушкі, якія характарызуюць рост і целасклад чалавека: ***Жмых*** – дзяўчына нізкага росту, ***Амбал*** – буйны мужчына.
5. Мянушкі, дадзеныя па асобных частках чалавечага цела*:* ***Калабок*** – мужчына, у якога былі круглыя ногі, ***Крук*** – хлопец з доўгім носам, ***Балячкін*** – мужчына, у якога ўвесь твар у "больках".
6. Мянушкі, якія характарызуюць асобу паводле яе ўнутраных якасцяў, характару: ***Вяпла*** – безуважлівая, непрыемная жанчына, ***Мыш*** – чалавек, які заўсёды непрыкметны.
7. Мянушкі, якія звязаны з пэўнымі здарэннямі або падзеямі ў жыцці чалавека, звычкамі, паводзінамі: ***Сарві Галава*** – жанчына, якая ў дзяцінстве падпаліла ферму, ніколі не сядзела на месцы, ***Шкварка*** – чалавек, які шапялявіць, ***Сіні Туман*** – бабуля, якую ўсе баяліся таму, што яна жыла ў сіняй хаце і нібы забівала людзей.
8. Мянушкі ад продкаў, сямейныя мянушкі: ***Лявонава Унучка*** – дзяўчына, у якой дзед Лявон, ***Літоўцы*** – сям'я, якая прыязджае летам у вёску з Літвы, ***Малодшыя Лявонавы*** – так празвалі адну сям'ю ў вёсцы, акрамя яе ёсць яшчэ дзве сям'і з такім жа прозвішчам *Лявонавы.*
9. Мянушкі-абрэвіятуры: ***СБ*** – Сяргей Барысавіч.

Мянушкі ўтвараюцца рознымі спосабамі. Утварэнне мянушак ад прозвішчаў у асноўным пераважае ў маладзёжным асяроддзі, але і больш дарослыя людзі таксама маюць мянушкі. Утвараюцца мянушкі шляхам адкідвання ад прозвішча фармантаў -евіч, -ін, -ын, -скі. Падобны тып мянушак ад прозвішча складае значную частку ад агульнай колькасці мянушак. Ад прозвішчаў утвараюцца мянушкі як нейтральнага, так і негатыўнага характару. Да нейтральных, якія не выклікаюць крыўды, бо не адрозніваюцца па сутнасці ў плане семантыкі ад саміх прозвішчаў, адносяцца мянушкі: ***Гінчыха*** (Гінько),

***Баханіха*** (Бохан). Існуе і другі шлях утварэння мянушак ад прозвішча: адкідваецца не толькі фармант, але і суфіксы, якія адносяцца да асновы тых імёнаў і апелятываў, ад якіх прозвішчы былі ўтвораны: Грышанін – ***Грыша,*** Гарбінскі – ***Гар, Гарык***. Распаўсюджана ўтварэнне мянушак ад прозвішчаў па сугучнасці: ***Пуп*** (Пупін), ***Швея*** (Шваякоў). Мянушкі таксама могуць утварацца ад прозвішчаў пры дапамозе частковай замены гукаў або ўстаўкай гукаў: ***Мандарынка*** (Бандарэнка), ***Пякарская*** (Пікачу), ад асабовых імёнаў, практычна тымі ж спосабамі, што і ад прозвішчаў: ***Мечык*** (Мечаслаў), ***Валерон*** (Валерыя).

Такім чынам, сучасныя мянушкі – гэта складаны і ўнікальны свет, які займае вельмі значнае месца ў моўнай карціне свету індывіда і шырока бытуе ў нефармальнай сферы камунікацыі. Як і многія іншыя сацыяльныя з’явы, сістэма мянушак, верагодна, з’яўляецца не толькі формай салідарнасці, але і крыніцай іншых формаў сацыяльнай актыўнасці, напрыклад, дражнення, кепікаў і прыніжэння, абразы. Мянушка таксама можа служыць праявай сімпатыі. Мянушкі існуюць у малым соцыуме – сям’і, сярод школьнікаў і студэнтаў, у вузкім прафесійным калектыве, у сельскай мясцовасці, дзе людзі добра ведаюць адзін аднаго. Мянушкі ў сельскай мясцовасці, на нашу думку, больш разнастайныя па семантыцы, структурных мадэлях, а таксама па спосабе намінацыі. Многія найменні маюць дыялектную аснову, іх вывучэнне дазваляе паказаць своеасаблівасць дадзенай мясцовасці.

**Літаратура**


1. Мезенка, Г. М. Беларуская антрапанімія : вучэбны дапаможнік / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш. ] – Віцебск : УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2009. – 254 с.
2. Струкаў, В. Мянушка як антрапонім у беларускай мове / В. Струкаў // Роднае слова. – 2004. – № 4. – С. 40–41.
3. Шумская, І. А. Дэрывацыя мужчынскіх асабовых найменняў: на матэрыяле гаворак Брэстчыны / І. А. Шумская // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках : тез. докл. III респ. конф. : в 2 ч. – Гродно, 1989. – Ч. 2. – С. 108–110.